Беларуская нацыянальная платформа

Форум грамадзянскай супольнасці

Усходняга партнёрства

# Рэзалюцыя

## Канферэнцыі Беларускай нацыянальнай платформы
## Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства

## **“Грамадзянская супольнасць Беларусі: выклікі застою і адзяржаўлення трэцяга сектара”**

*Мінск, 25 чэрвеня 2015 года*

Мы, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства, вітаем агульны працэс узнаўлення дыялогу Беларусі з Еўрапейскім Саюзам. У тым ліку:

- перамовы беларускага ўрада і Еўрапейскага Саюза па магчымай праграме мадэрнізацыі для Беларусі ў фармаце “прамежкавай фазы” двухбаковых адносін. Мы адзначаем важнасць як мага больш хуткага адкрыцця еўрапейска-беларускага дыялогу па правах чалавека, прадугледжанага Дэкларацыяй Рыжскага саміта Усходняга партнёрства;

- прагрэс у перамовах па спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі. Мы заклікаем бакі прыкласці ўсе магчымыя намаганні, каб зняць апошнія перашкоды да падпісання пагаднення;

- прыняцце Беларусі ў Еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі. Заклікаем беларускія ўлады да належнага, канструктыўнага, адкрытага і інклюзіўнага працэсу рэалізацыі “дарожнай мапы” рэформ вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі Балонскай сістэмы;

- ініцыятыву Рэспублікі Беларусь па ўсталяванні Панэлі па гарманізацыі лічбавых рынкаў. Мы падкрэсліваем неабходнасць следавання прынцыпам Хартыі пра адкрытыя дадзеныя, таксама як і забеспячэння агульнай свабоды цыркуляцыі інфармацыі ў краіне.

У той жа час, мы вымушаны канстатаваць адсутнасць фактычнага прагрэсу ў галіне правоў чалавека, належнага кіравання, дэмакратыі і спрыяльных ўмоў для дзейнасці грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. У краіне за кратамі застаюцца палітычныя вязні: Мікалай Статкевіч, Мікалай Дзядок, Ігар Аліневіч, Яўген Васьковіч, Арцём Пракапенка, Юрый Рубцоў. У апошнія месяцы пашырылася практыка ціску на палітычных вязняў. Па сведчаннях беларускіх праваабаронцаў, стаў больш жорсткім рэжым утрымання ў дачыненні да палітвязня Мікалая Статкевіча, да новага тэрміну пазбаўлення волі на два гады быў прысуджаны палітвязень Юрый Рубцоў, палітвязні Ігар Аліневіч і Мікалай Дзядок падвяргаліся ціску ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар.

Працягваецца практыка абмежавання свабоды слова, ціску на незалежныя медыя і пераследу незалежных журналістаў і дэмакратычных актывістаў. У краіне адсутнічаюць належныя ўмовы для рэалізацыі свабоды

асацыяцый, грамадзянская супольнасць выключана з працэсу дыялогу з уладамі па найбольш вострых пытаннях рэалізацыі правоў чалавека, належнага кіравання і дэмакратыі.

Мы чарговы раз вымушаны адзначаць адсутнасць неабходных палітычных і прававых умоў для правядзення свабодных і дэмакратычных выбараў. Мы заклікаем прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і дэмакратычнай апазіцыі адмовіцца ад удзелу ў чарговай электаральнай маніпуляцыі.

Мы па-ранейшаму занепакоены сітуацыяй непрыкрытай ваеннай агрэсіі Расіі супраць Украіны, а таксама незаконнай анексіяй Расійскай Федэрацыяй часткі ўкраінскай тэрыторыі — Крыму. Мы лічым, што пазіцыя беларускіх уладаў адносна гэтага пытання не ёсць канструктыўнай і падрывае сяброўскія адносіны паміж народамі Украіны і Беларусі.

Мы падкрэсліваем, што праблемы ў галіне правоў чалавека, належнага кіравання, дэмакратыі і спрыяльных ўмоў для дзейнасці грамадзянскай супольнасці застаюцца галоўнымі перашкодамі для еўрапеізацыі Беларусі. Мы заклікаем беларускія ўлады, структуры ЕС, краіны ЕС, прадстаўнікоў беларускай грамадзянскай супольнасці да сумесных намаганняў у вырашэнні гэтых ключавых праблем.